This article is distributed under the terms of the Creative Commons Attribution 3.0 PL
© Copyright by Uniwersytet Warszawski Katedra Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej & individual articles to their Authors

doi: 10.32612/uw.2543618X.2021.pp.31-53

Przegląd Środkowo-Wschodni, 6, 2021
ISSN 2543-618X eISSN 2545-1324

Nr art. 20210602

Data przesłania: 29.05.2021
Data akceptacji: 26.06.2021

**Наталля Сліж**
Uniwersytet w Białymstoku
ORCID: 0000-0002-9907-9761

# Праца гарадзенскага магістрата ў другой палове XVII ст.[1]

**Działalność magistratu grodzieńskiego w drugiej połowie XVII wieku**

Artykuł ten poświęcony jest działalności grodzieńskiego magistratu w drugiej połowie XVII w. Trudne lata wojny 1654–1667 spowodowały problemy związane z przywróceniem pracy magistratu. Autorka poddała analizie miejskie księgi sądownicze i doszła do wniosku, że w omawianym okresie wzrosła rola wójta, który uczestniczył w zebraniach i nadzorował pracę magistratu. Tymczasem działalność sędziego napotkała szereg problemów. Wojska moskiewskie poważnie uszkodziły archiwum dworskie, miasto zaś zostało zrujnowane. W rezultacie zmniejszyła się liczba ludności miasta. Jednocześnie ludność miasta popadła w ubóstwo. Grodno jako miasto przeżywało kryzys finansowy, co sprawiło, że mnożyły się przypadki korupcji wśród urzędników. Powrót do normalnego funkcjonowania miasta wymagał dłuższego czasu.

Słowa kluczowe: Grodno, magistrat, sądownictwo, wójt

Функцыянаванне сістэмы кіравання ў Вялікім Княстве Літоўскім вывучаецца даўно. У гэтым рэчышчы з’явіліся таксама даследаванні прысвечаныя працы гарадзенскага магістрата ў XVII ст.[2] Аўтарка

[1] Даследаванне выканана дзякуючы навуковай стажыроўцы пры Універсітэце ў Беластоку па праграме “Салідарныя з Беларуссю”.

[2] P. Borowik, *Funkcjonowanie samorządu miejskiego w Grodnie podczas „potopu moskiewskiego” (1655–1661) oraz kilka uwag o zniszczeniu miasta przez Moskali*,

дадзенага артыкула засяродзіла ўвагу на дзейнасці гарадскога самакіравання ў другой палове XVII ст. У публікацыі разглядаецца цяжкі перыяд вайны 1654–1667 гг., а таксама праблемы звязаныя з аднаўленнем працы магістрату. Даследаванне праведзена на падставе аналізу кніг войтаўска-лаўніцкага і войтаўскага судоў.

*Магістрат падчас вайны 1654–1667 гг.* Падчас вайны з Расіяй Гародня двойчы прайшла праз маскоўскую акупацыю. Першы раз маскоўскія войскі захапілі горад 5 верасня 1655 г., але 19 сакавіка 1659 г. горад зноў перайшоў да ВКЛ. Аднак вызваленне пратрымалася нядоўга, паколькі ўжо 11 снежня войскі ваяводы Івана Хаванскага былі на падыходзе да горада, З 24 – узялі яго без бітвы. Прычынай захопу Гародні былі свавольныя дзеянні шляхты. У лютым 1660 г. у горад чарговы раз прыйшлі маскоўскія войскі. Канчаткова Гародня была вызвалена ў верасні гэтага ж года, а невялікая група маскалёў пратрымалася ў замку ажно да 19 сакавіка 1661 г.[3]

У перыяд акупацыі магістрат працаваў, але з цяжкасцямі, таму не заўсёды атрымлівалася на практыцы рэалізоўваць артыкулы заканадаўства. У 1657 г. нават адбыліся выбары бурмістраў, на якіх перамаглі Ян Адамовіч і Ян Зеляпуга. Апошняга на наступны год

---

[у:] *Гарадзенскі палімпсест XII–XX стст. Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі (Гародня, 7 лістапада 2008 г.)*, пад рэд. А. Смаленчука, Н. Сліж, Гародня–Беласток 2008, с. 29–39; З. Яцкевіч, В. Урублеўскі, *Гарадзенскі магістрат у XVII ст.* [у:] *Гарадзенскі палімпсест. 2009. Дзяржаўныя ўстановы і палітычнае жыццё. XV–XX ст.*, пад рэд. А. Смаленчука, Н. Сліж, Гародня 2009, с. 75–117; Н. Сліж, *Гарадзенскі бурмістраўска-радзецкі суд: суадносіны судовай практыкі з магдэбургскім правам (1639–1642 гады)*, „Палітычная сфера. Гісторыя: літаратура, права, палітыка", 2014–2015. № 22–23, с. 35–51; Н. Сліж, *Гарадзенскі войтаўска-лаўніцкі суд (1638–1644 гг.): суадносіны судовай практыкі з магдэбургскім правам*, „Białoruskie Zeszyty Historyczne", 2016, t. 45, s. 46–71.

[3] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей: НГАБ), ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 25 адв. Archiwum Główne Aktów Dawnych (далей: AGAD), Archiwum Radziwiłłów (далей: AR), dz. IV, kopie, sygn. 745, k. 128–131; AR, dz. V, sygn. 11208/II, k. 191–194; sygn. 1735, k. 27–30; К. Касажэцкі, *Кампанія 1660 году ў Літве*, Мінск 2011, с. 110–114, 317–318.

змяніў Мікалай Васілевіч[4]. Але як сведчыць выпіс з войтаўскага суда ў 1657 г. магістрат не працаваў нармальна. 20 мая Дарота Бурбянка вымушана была сваю апошнюю волю выказаць перад бурмістрам Я. Адамовічам, а сужэнцы Крысціна Вербікоўна і Андрэй Філіповіч – перад гарадзенскім намеснікам Андрэем Грушчынскім[5]. Частка ўраднікаў памерла ад пошасці ці ад рук ворага. Так, напрыклад, хворы лаўнік Ян Фандэберк памёр у Хадарова. Перад смерцю ён агучыў свой тэстамент перад падстарастам Аляксандрам Міхалам Машчынскім 22 лістапада 1657 г.[6]

Да вайны гарадзенскі магістрат складаўся з войта, лентвойта, рады (12 асоб разам з двума бурмістрамі) і лавы (12 асоб). Аднак у 1659 г. колькасць чальцаў магістрату зменшылася. У гэты час у крыніцах згадваюцца наступныя ўраднікі: войт Канстанты Александровіч, лентвойт Ганус Паўльсен, бурмістры Ян Адамовіч і Мікалай Васілевіч, радцы – Якуб Шаматула Сапінскі, Мікалай Кудаеўскі, Фольтын Шульц, Ян Цвікліч, Адам Цвікліч, Ян Явароўскі, Павел Кроснеўскі, лаўнікі – Пётр Дзіва, Багдан Яцкевіч, Мікалай Багдановіч, Ян Зеляпуга, Пётр Ляўковіч, Эрхард Вільд, лаўнічы пісар Павел Варабеевіч (памёр 21.06.1659 г.), радскі пісар Аляксандр Дрогаш, сендык Лукаш Дорбах. Такім чынам у радзе было 10 чалавек, а ў лаве – 6[7].

Захавалася няшмат дакументаў аб дзейнасці магістрату за 1659 і 1660 гг. У 1659 г. орган аднавіў працу пасля першай акупацыі, але амаль увесь 1660 г. горад зноў знаходзіўся пад акупацыяй. Ураднікі пачалі рэгулярную працу толькі ў канцы года, калі горад быў цалкам вызвалены. У 1659 г. выбары ў магістрат былі перанесены

---

[4] *Metryka Litewska. Księga wpisów nr 131*, oprac. A. Rachuba, Warszawa 2001, s. 229; P. Borowik, *op.cit.,* c. 29–39.

[5] Lietuvos Valstybės istorijos archyvas (далей: LVIA), f. 694, ap. 1, b. 4663, l. 1; НГАБ, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 25 адв.-26.

[6] P. Borowik, *op.cit.,* c. 33, 34; Н. Сліж, *Купцы Фандэберкі ў Гародні ў XVII* ст., „Архіварыус”, 2016, вып. 14, с. 351, 355.

[7] LVIA, f. 694, ap. 1, b. 4663, l. 1; НГАБ, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 3, 7, 10, 11, 13, 20.

з 30 ліпеня на 4 жніўня, паколькі адсутнічалі радцы, лаўнікі, цэхмайстры і шмат хто з паспольства. Улады абавязалі ўсіх мяшчан прыйсці на выбары пад пагрозай спагнання грошай. Умоўнае пакаранне складала: у выпадку радцаў – 4 капы літоўскіх грошаў, сендыкаў і цэхмайстраў – 2 капы, З паспольства – па 1 капе. Палова атрыманай сумы ішла на ўтрыманне ратушы, З палова – войту. На выбарах, якія адбыліся 4 жніўня, з 4-х кандыдатаў былі выбраны бурмістрамі радцы Адам Цвікліч і Якуб Шаматула[8].

Прыход войскаў Хаванскага прымусіў мяшчан, а таксама ўраднікаў пакінуць горад. Так, бурмістр Ян Адамовіч сведчыў, што пры другой маскоўскай інтэрвенцыі, пад мястэчкам Ліпск акупацыйныя войскі забралі ў яго дакументы па гарадскіх прыходах і расходах за перыяд яго кіравання, а таксама канфіскавалі яго дакументы на фальварак. Лаўнічы пісар Аляксандр Дрогаш таксама пакінуў горад, чым скарысталіся яго суседзі ў Баранавічах і забралі ў яго жыта 50 коп, ячменю 20 і грэчкі 50[9].

*Аднаўленне працы магістрату.* У выніку вайны і акупацыі гарадзенская ратуша была зруйнавана, таму паседжанні адбываліся ў розных месцах: у доме радцы Адама Цвікліча (тут упершыню згадваецца пра руйнаванне ратушы маскалямі)[10], радцы Я. Зеляпугі[11], у ратушы[12], у судовым доме[13], у доме лаўніка Ф. Бабрыкевіча[14],

[8] НГАБ, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 9-11 адв.; P. Borowik, *op.cit.,* с. 34, 35.

[9] НГАБ, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 25, 25 адв.; P. Borowik, *op.cit.,* с. 35.

[10] НГАБ, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 6.

[11] Ibidem, арк. 42, 42 адв., 46.

[12] Ibidem, арк. 16, 17 адв., 20 адв., 28, 99 адв., 101 адв., 102, 102 адв., 118.

[13] Ibidem, арк. 47, 50 адв., 51, 52, 65, 71, 72 адв., 77, 79, 80 адв., 85, 86, 87 адв., 91 адв., 94 адв., 95 адв., 100 адв., 104, 106 адв., 111, 112 адв., 118 адв., 120, 121, 123 адв., 124 адв., 125, 127 адв., 128 адв., 137, 138 адв., 139 адв., 141, 142, 143, 145 адв., 148, 157, 159, 165 адв., 170, 170 адв., 176, 178, 178 адв., 182 адв., 187, 190 адв., 194, 195, 198 адв., 201, 203 адв., 206 адв., 210, 215, 216, 217, 218, 220, 221 адв., 226 адв., 230, 252 адв., 256, 257, 259, 260, 269 адв.-271, 277, 304, 305 адв.

[14] Ibidem, арк. 53, 55 адв.

у доме Канстантыя Дзівы[15], Марціна Шаматулы Сапінскага[16], бурмістра Адама Цвікліча[17], старога бурмістра Эрхарда Вільда[18], лентвойта Гануса Паўльсена[19]. Трэба адзначыць, што ратуша не была адноўлена ў XVII ст.

Радцы і лаўнікі фігуруюць разам у войтаўска-лаўніцкім судзе да 1662 г. Час ад часу на сесіях прысутнічалі бурмістры. Акрамя таго, сумесныя паседжанні адбываліся падчас выбараў[20]. У кнізе войта сустракаюцца асобна выпісы з бурмістраўска-радзецкага суда, што сведчыць пра асобную працу гэтага суда[21]. Аднак кніг за гэты перыяд не захавалася.

Пасля аблогі маскоўскіх войск магістрат сабраўся на сесію 9 верасня 1660 г. у наступным складзе: лентвойт Ганус Паўльсен, бурмістр Ян Адамовіч, радца Якуб Шаматула Сапінскі, лаўнікі – Пётр Ляўковіч, Пётр Дзіва, Ян Зеляпуга, Мікалай Багдановіч. Асноўнай мэтай удзельнікаў паседжання было жаданне навесці парадак пасля акупацыі ў справаводстве ў адпаведнасці з прывілеямі. Неўзабаве былі праведзены выбары, у выніку якіх сендыкамі былі абраны Адам Іванішэўскі і Фёдар Бабрыкевіч, а бурмістрамі – Г. Паўльсен, Я. Зеляпуга (выбары былі з чатырох кандыдатур (Г. Паўльсен, Я. Зеляпуга, Я. Адамовіч, П. Ляўковіч). Але выбары не далі магчымасці набраць патрэбнай колькасці ўраднікаў, якія былі да вайны[22].

---

[15] Ibidem, арк. 62.

[16] Ibidem, арк. 62 адв.

[17] Ibidem, арк. 88.

[18] Ibidem, арк. 159.

[19] Ibidem, арк. 268.

[20] НГАБ, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 117, 130 адв., 138, 150 адв.; ф. 1761, воп. 1, спр. 2, арк. 288, 291-291 адв.

[21] НГАБ, ф. 1761, воп. 1, спр. 2, арк. 75, 138 адв., 235-235 адв., 309-309 адв., 315, 398, 434 адв.

[22] НГАБ, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 27; P. Borowik, *op.cit.,* c. 31. а артыкуле адзначаецца, што М. Барысовіч мог быць бурмістрам у 1659 г., але гэта не пацвярджаюць іншыя дакументы.

У XVII ст. у Гародні дзейнічала традыцыя праводзіць выбары на пачатку года, але ў сувязі з вайной яны былі праведзены ў верасні. Аднак у наступным годзе было вырашана аднавіць ранейшую традыцыю. Выбары на 1661 г. прайшлі 14 студзеня. Сярод ураднікаў самакіравання прысутнічалі: лентвойт і бурмістр Ганус Паўльсен, бурмістр Ян Зеляпуга, радца Якуб Шаматула Сапінскі, лаўнікі Пётр Дзіва, Мікалай Багдановіч, сендык Лукаш Дорбах, цэхмайстры і паспольства. Тым часам адсутнічалі наступныя асобы: радцы Ян Цвікліч, Мікалай Кудаеўскі, Фольтын Шульц, Войцех Пятроўскі, Ян Явароўскі, Адам Цвікліч, лаўнікі Станіслаў Панятоўскі, Эрхард Вільд, сендык Лявон Ласкевіч. Такое становішча выклікала пратэст у войта і паспольства, бо ўсе, хто адсутнічаў, ведалі пра тэрмін выбараў. На пасаду лаўніка прэтэндавала 14 кандыдатаў: Адам Іванішэўскі, Лявон Ласкевіч, Марцін Шаматула Сапінскі, Лукаш Дорбах, Марцін Казакевіч, Максім Курыловіч, Канстанты Дзіва, Мікалай Васілевіч, Каспер Варабеевіч, Аляксандр Карлоўскі, Ян Рымар, Фёдар Бабрыкевіч, Мацей (Матыяш) Масніцкі, Міхаіл Хейварт. Найбольшую колькасць галасоў набралі Мікалай Васілевіч, К. Дзіва, А. Карлоўскі, М. Шаматула Сапінскі, К. Варабеевіч, М. Масніцкі, Ф. Бабрыкевіч. Усе яны прысягнулі 15 студзеня, акрамя Канстантыя Дзівы, якога выбралі ў яго адсутнасць.

Былы бурмістр Ян Адамовіч не прыбыў на заканчэнне выбараў, што выклікала пратэст войта. Тым часам на пасаду радцы прэтэндавалі Пётр Ляўковіч, Ян Зеляпуга, Пётр Дзіва, Мікалай Васілевіч, Станіслаў Панятоўскі і Мікалай Багдановіч. У выніку абраны былі Пётр Ляўковіч, Ян Зеляпуга, Мікалай Васілевіч. Кандыдатамі на бурмістраў былі Я. Адамовіч, П. Ляўковіч, М. Васілевіч, Якуб Шаматула, сярод якіх два першыя перамаглі. Пры гэтым Адамовіч выканаў прысягу адразу, а прысяга Ляўковіча была адкладзена на 17 студзеня[23].

---

[23] НГАБ, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 42 адв.-43 адв.; З. Яцкевіч, В. Урублеўскі, *op.cit.,* с. 88, 93–94. Дакумент надрукаваны ў дадатках артыкула.

Падчас выбараў было ўзнята пытанне аб справаздачы папярэдніх бурмістраў: Фольтына Шульца і Андрэйя Каспровіча (1652); Яна Яваро ўскага і Яна Адамовіча (1653); Фольтына Шульца і Якуба Шаматулы Сапінскага; Войцеха Пятроўскага і Мацея Ябланоўскага; Мікалая Кудаеўскага і Пётра Ляўковіча, якія былі пасламі да Варшавы ад горада[24]; Пётра Ляўковіча і Міхаіла Хейварта (Эйварта); Яна Адамовіча і Яна Зеляпугі (1657); Яна Адамовіча і Мікалая Васілевіча (1658, 1659); Мікалая Багдановіча і Міхаіла Барысовіча (1660?); Ганууса Паўльсена і Яна Зеляпугі (1660)[25].

У гэты спіс трапілі таксама бурмістры, якія займалі пасады да вайны і ў перыяд акупацыі. На дакуменце адсутнічае дата, таму не заўсёды падаецца магчымым ідэнтыфікаваць перыяд знаходжання на пасадзе кожнага з бурмістраў. Акрамя таго, на нашу думку, дакумент можа ўтрымліваць памылкі. Так, Ф. Шульц быў бурмістрам разам з Я. Адамовічам у 1650 г., М. Кудаеўскі з Т. Лагоўскім – у 1655 г. Вядома, што Лагоўскі памёр падчас вайны (да 1657 г.). Гэта магло адбыцца і ў 1655 г., а яго месца мог заняць П. Ляўковіч. За 1654 г. нам атрымалася выявіць згадку пра аднаго бурмістра Станіслава Цвікліча.

Намі не знойдзена дакументаў за 1651 і 1656 гг. з пералікамураднікаў. У сувязі з гэтым складана адказаць на пытанне, ў які перыяд пасады бурмістра займалі Ф. Шульц і лаўнік Я. Шаматула Сапінскі, радца В. Пятроўскі і радца М. Ябланоўскі, лаўнік П. Ляўковіч і музыка М. Хейварт (Эйварт). Польскі даследчык Пшэмыслаў Баравік ставіць іх бурмістраўства ў наступным храналагічным парадку 1654, 1655, 1656 гг., што аднак не знаходзіць пацвярджэння. Аднак у дачыненні да Ляўковіча, Хейварта, Барысовіча, Багдановіча

[24] М. Кудаеўскі і П. Ляўковіч ездзілі ў Варшаву ў 1659 г. За гэта горад быў вінен Ляўковічу 132 злотых і 22 грошаў. НГАБ, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 59–59 адв.

[25] Гэты спіс ураднікаў прыводзіцца ў артыкуле са спробай вызначыць даты займання пасады бурмістраў. Але не ва ўсіх выпадках гэта адпавядае. P. Borowik, op.cit., c. 30–31.

даследчык слушна заўважыў, што яны занялі пасады неадпаведна, бо не былі нават радцамі[26]. Падобная сітуацыя была магчыма толькі ў надзвычайнай сітуацыі, калі адчуваўся недахоп ураднікаў. Верагодна, што на працягу года змянілася некалькі бурмістраў. З дакументаў вынікае, што Шульц быў бурмістрам у 1652 г., тым часам пра М. Барысовіча ў дакументах толькі згадваецца, што ён быў бурмістрам падчас акупацыі. Пры гэтым вядома, што ён выконваў абавязкі разам з М. Багдановічам. Барысовіч атрымаў пасаду сендыка толькі ў 1664 г., а Багдановіч быў лаўнікам. Ён стаў радцам у 1662 г. У сувязі з ад'ездам ураднікаў у 1660 г. Барысовіч і Багдановіч вымушаны былі выконваць пасады бурмістраў. А пасля вызвалення горада абраныя раней бурмістры Ян Зеляпуга і Ян Адамовіч выконвалі свае абавязкі да выбараў. У магістрацкай кнізе занатаваны толькі асобныя справаздачы, таму ўдакладніць даты можна будзе толькі пры выяўленні дадатковых крыніц.

Магістрат прад'яўляў прэтэнзіі таксама да іншых ураднікаў. На сесіі 1 лютага 1661 г. у прысутнасці бурмістраў Я. Адамовіча і П. Ляўковіча, радцаў Я. Шаматулы, Я. Зеляпугі, М. Васілевіча, лаўніка М. Багдановіча войт К. Александровіч падаў скаргу на бурмістраў мінулага году Г. Паўльсена і Я. Зеляпугу за тое, што яны не зрабілі справаздачу[27].

На сесіі магістрату 4 лютага 1662 г. быў разгледжаны шэраг спраў[28]. Прызначаны на пасаду лентвойта Казімір Цвікліч выканаў прысягу. Быў абраны войтаўскі слуга Яско Хаматоўскі. Ён таксама выканаў прысягу. Былы бурмістр Ф. Шульц прапанаваў перанесці справаздачы мінулагодніх бурмістраў Я. Адамовіча і П. Ляўковіча з 16 студзеня на 31, а пасля – на 4 лютага. Апрача таго ён выказаў гатоўнасць прадставіць дакументы аб абавязковай справаздачы бурмістраў і прадставіў ліст караля з 1653 г.[29] Таксама ён адзначыў,

[26] Ibidem, c. 31, 33.
[27] НГАБ, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 45 адв.
[28] Ibidem, арк. 53–54.
[29] Верагодна тут гаворка ідзе пра пастанову камісараў ад 16 снежня 1650 г.,

што не ўсе ўраднікі выканалі свае абавязкі. Сярод іх былі М. Ябланоўскі, В. Пятроўскі, якія не прадставілі сваіх справаздач і не з'явіліся на сесію. У сваю чаргу Сымон Шаматула Сапінскі прасіў, каб Шульц даў копію сваіх рэестраў.

Войт пратэставаў супраць дзеянняў лентвойта і бурмістра Г. Паўльсена. Ён не перадаў урад лентвойта, не здаў пячатку, а пры гэтым стаў бурмістрам. Лаўнікі Пётр Дзіва і Мацей Масніцкі таксама выступілі супраць Паўльсена, бо ён узяў пячатку лавы, пратрымаў яе год і браў пазыкі. Акрамя таго аказалася, што Ян Зелепуга забраў пячатку лавы падчас маскоўскай акупацыі і скрынку для яе, але аддаў пячатку без скрынкі.

Наступная скарга К. Александровіча была скіравана супраць папярэдніх бурмістраў Я. Адамовіча і П. Ляўковіча, а тычалася яна пазыкі ў памеры 260 злотых. Грошы былі пазычаны ад магістрату і ўсяго паспольства падчас іх бурмістраўства. У сувязі з гэтым Я. Адамовіч прасіў перанясення выплаты пазыкі на 13 лютага па прычыне страт выкліканых маскоўскай акупацыяй, на што быў дадзены дазвол. Выбіраць доўг былі абраны: з горада – Ян Цвікліч і радца Мікалай Багданкевіч, лаўнікі Марцін Шаматула і Лявон Ласкевіч, з Альшанкі – радца Мікалай Кудаеўскі і лаўнік Мацей Масніцкі, з Гібуліч – Ян Цвікліч і Каспер Урублеўскі, з – Баранавічаў, Адамовічаў, Міцкевічаў – лаўнік Адам Іванішэўскі і Сымон Шаматула, з Капліцы і Грандзіч – радца Якуб Шаматула.

П. Ляўковіч хварэў ужо ў канцы 1661 г., таму выклікаў да сябе ўраднікаў для запісу тэстамента 19 снежня, а актыкавыны дакумент быў 6 лютага 1662 г. У сувязі са станам здароўя справаздачу за бурмістраўства не прадставіў. Аднак у тэстаменце адзначалася,

---

якая была падпісана Янам Казімірам 25 студзеня 1652 г. Не выключаем магчымасць, што пад датай згаданай у дакуменце пастанова была актыкавана ў кнігі гарадзенскага магістрата. Але згаданыя пункты на сесіі адпавядаюць зместу пастановы 1650 г. А. Доўнар, *Пастанова камісараў Яна Казіміра Вазы 1650 года аб парадку кіравання ў Гародні,* [у:] *Гарадзенскі палімпсест. 2009. Дзяржаўныя ўстановы і палітычнае жыццё. XV–XXст.,* пад рэд. А. Смаленчука, Н. Сліж, Гародня 2009, с. 118–127.

што горад яму вінен за выдаткі на жаўнераў. Яны былі занатаваны ў асобным рэестры[30].

Я. Адамовіч таксама памёр не здаўшы справаздачу. У сваім тэстаменце (1666) бурмістр адзначыў, што на патрэбы горада ён пазычыў грошы ў Г. Паўльсена, М. Шаматулы, Ф. Бабрыкевіча. Акрамя таго ў С. Шаматулы бурмістр пазычыў салянку аўса. У 1667 г. справаздачу за 1661 г. прадставілі жонка Ягнешка Весянеўская і яе сын лаўнік Тамаш Адамовіч. Разлік прыходу і расходу паказаў, што сваіх грошай Адамовіч выдаткаваў 439 злотых і 23 грошаў, а ў Паўльсена пазычыў 641 злотых і 12 грошаў. Гэтыя сродкі пайшлі на патрэбы горада. У якасці доказу спадчыннікі прадставілі тэстамент і рэестр. Справаздачу Адамовіча жонка і сын былі гатовы пацвердзіць прысягай. Разам з тым фінансавая разлікі выклікалі недавер у Готфрыда Варланга і Юзафа Адамовіча. Сендыкі звярнулі ўвагу на тое, што пры жыцці бурмістр не дапільнаваў правядзення аналізу выдаткаў з крамы, адкуль былі выдаткаваны грошы на патрэбы Адамовіча. Акрамя таго падазронасць выклікала адсутнасць асобнага пазыковага запісу Паўльсену і запісу пра выдаткі на горад у суме 439 злотых і 23 грошаў. У выніку горад адмовіўся выплаціць усе грошы, а толькі 125 злотых. Што тычыцца пазыкі Паўльсену, дык было вырашана, што яна будзе выплачана пасля выканання прысягі 5 верасня жонкай і сынам[31].

На сённяшні дзень даследчыкам не ўдалося выявіць рэестры бурмістраў, у якіх адзначаліся выдаткі горада і іншыя фінансавыя аперацыі. Справаздача Ф. Шульца за 1652 г. дазваляе ўявіць некаторыя асаблівасці выканання абавязкаў бурмістра. Гэта самая ранейшая справаздача, хоць ускосная інфармацыя пра ранейшыя дакументы захавалася. Дзякуючы гэтым сведчанням вядома, што Ф. Шульц выконваў абавязкі разам з нябожчыкам А. Каспровічам. Тэрмін іх кіравання скончыўся ў 1653 г. і па пастанове камісараў

[30] НГАБ, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 58 адв.–60 адв.

[31] Ibidem, арк. 126, 151 адв.–152.

ураднікі адразу павінны былі справаздачыцца. Аднак у практыцы адбылося гэта толькі ў 1662 г., праз 10 год. Гэта была не адзінкавая сітуацыя, паколькі падобныя пытанні ўздымаліся войтам вельмі часта. Асноўная функцыя бурмістраў заключалася ў вядзенні фінансавых спраў горада. Пасля яны прадстаўлялі выдаткі на асобных рэестрах. На патрэбы горада грошы маглі пазычацца, як гэта было ў выпадку гарадзенскага яўрэя Лазара, у якога горад пазычыў 200 злотых, а яшчэ 300 у старшых яўрэяў. Аднак асноўная віна Шульца была ў тым, што пра гэтыя пазыкі ніхто не ведаў: ні магістрат, ні паспольства. У сувязі з гэтым Паўльсен патрабаваў прадставіць адпаведныя дакументы, каб ведаць сведак пазыковага запісу. Шульц адмовіўся гэта зрабіць аргументуючы гэта тым, што ўжо няма ў жывых, тых хто ведаў пра пазыкі, а іншыя адсутнічаюць на пасяджэнні. Пры гэтым былы бурмістр гатовы быў прысягнуць, каб пацьвердзіць, што на патрэбу горада ён даў уласныя грошы: 178 злотых і 18,5 грошаў. У выніку магістрат пастанавіў пасля выканання прысягі выплаціць яму 288 злотых і 6,5 грошаў у трох частках на працягу 18 тыдняў[32].

Са скаргі ад 1 сакавіка 1661 г. вядома яшчэ пра адну пазыку Шульца. Антоні Пашкевіч з Гарадзенскага павета, выклікаў яго ў суд па прычыне нявыплаты 300 злотых. Яшчэ ў 1659 г. ён павінен быў вярнуць пазыку, але не змог аддаць у тэрмін з-за вайны. Да таго ж, грошы браліся для горада, калі ён быў бурмістрам[33].

Чарговыя выбары ў магістраце адбыліся 17 студзеня 1663 г. На бурмістраўства прэтэндавалі Эрхард Вільд, Ян Зеляпуга, Ян Адамовіч і Якуб Шаматула, аднак перамаглі два першыя. Тым часам радца Павел Кроснеўскі, які быў у складзе магістрата яшчэ з першай паловы XVII ст., адмовіўся ад пасады ў сувязі з узростам і слабасцю здароўя. Кандыдатамі ў лаву былі Канстанты Дзіва, Якуб Шараўскі, Сымон Шаматула Сапінскі, Марцін Казакевіч, Лукаш

[32] Ibidem, арк. 57–57 адв.
[33] Ibidem, арк. 46–46 адв.

Дорбах, Пётр Концкі. У выніку ў лаву трапілі Я. Шараўскі і П. Концкі, а пасаду сендыка атрымаў М. Казакевіч[34]. Аднак 31 студзеня Э. Вільд адмовіўся ад пасады бурмістра па прычыне веравызнання (ён быў пратэстантам) і адсутнасці ўладанняў у горадзе. Гэта былі слушныя аргументы, паколькі ў гарадзенскіх прывілеях адзначалася, што ў магістраце могуць засядаць толькі каталікі і ўласнікі маёмасці ў горадзе. Акрамя таго, супраць Вільда пачаўся працэс, які распачаў Ф. Шульц. Апошні абвінавачваў бурмістра ў няслушным займанні пасады, называючы яго Юдам. Больш за тое Вільд быў на службе ў караля і выконваў абавязкі стрыёўскага падляснічага. Сендыкі, цэхмайстры і паспольства прасілі яго застацца на пасадзе, бо ён ўжо паспеў прысягнуць, але Вільд настойваў на вызваленні, бо кароль ужо выклікаў яго на службу, а сумяшчаць дзве пасады не падавалася магчымым. Як дадатковы аргумент ён дараваў гораду пазыку ў 60 злотых. У выніку бурмістрам стаў Г. Паўльсен[35].

Чарговая сесія адбылася 4 лютага 1665 г., у якой узялі ўдзел войт К. Александровіч, бурмістры А. Цвікліч, К. Дзіва, лентвойт Г. Паўльсен, радцы Я. Адамовіч, В. Пятроўскі, М. Кудаеўскі, Я. Цвікліч, Я. Зеляпуга, М. Багдановіч, лаўнік Я. Шараўскі, М. Шаматула Сапінскі, Ф. Бабрыкевіч, Л. Ласкевіч, А. Іванішэўскі, П. Концкі. На гэтай сесіі планавалася правесці выбары. Аднак адсутнісць радцаў Я. Явароўскага, Я. Шаматулы Сапінскага, К. Цвікліча, лаўнікаў К. Урублеўскага, А. Карлоўскага, С. Шаматулы Сапінскага, кавальскага цэхмайстра Даніэля Юргелевіча, цэхмайстара мечнікаў Крыштафа Болейкі, цэхмайстара гарбароў Міхаіла Лаўрыновіча і цэхмайстраў рэзнікаў зрабіла немагчымым правядзенне выбараў. У выніку яны былі перанесены на 21 лютага[36].

Новае паседжанне магістрату адбылося 21 лютага, на якім Лукаш Дорбах адмовіўся ад пасады сендыка з-за слабасці здароўя. У выніку

---

[34] НГАБ, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 72; З. Яцкевіч, В. Урублеўскі, op.cit., c. 89, 95.

[35] НГАБ, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 72 адв.–73.

[36] Ibidem, арк. 111 адв.

прысутныя вырашылі абраць замест яго Юзафа Адамовіча. Кандыдатамі на бурмістраў сталі Ян Адамовіч, Якуб Шаматула, Войцех Пятровіч, Казімір Цвікліч. Апошнія два сталі бурмістрамі[37].

На паседжанне магістрату 9 кастрычніка 1665 г. бурмістры Адам Цвікліч і Канстанты Дзіва не зрабілі справаздачу за мінулы год, таму яе перанеслі на 2 лістапада. Акрамя таго была адкладзена выплата пазыкі 150 злотых ад горада. Наступнае паседжанне гарадскога самакіравання адбылося 4 лістапада, але правесці на ім справаздачу не атрымалася па прычыне адсутнасці бурмістра В. Пятроўскага і іншых ураднікаў. Лентвойт Г. Паўльсен (бурмістр 1662, 1663), радца Я. Зеляпуга (бурмістр 1663), радца А. Цвікліч (бурмістр 1662, 1664) прадставілі рэестры, а лаўнік М. Шаматула Сапінскі прадставіў рэестр выбрання пагалоўнага збору і справаздачу[38]. Найбольш верагодна, што фінансавыя дакументы горада вяліся асобна, але звяртае на сябе ўвагу тое, што своечасовая справаздача па-ранейшаму засталася праблемай у магістраце.

Чарговыя выбары адбыліся 20 лютага 1666 г., ў якіх узялі ўдзел: Якуб Шараўскі, Пётр Концкі, Мацей Масніцкі, Эрхард Вільд. У выніку двое апошніх былі абраны бурмістрамі, якія адразу прысягнулі. У лаву кандыдатамі былі абраны Адам Іванішэўскі і Тамаш. На гэтым паседжанні Захарыяш Ласковіч распавёў аб тым, што ў перыяд бурмістраўства А. Цвікліча і К. Дзівы ў яго былі пазычаны 33 злотых на гусарскую заругву, якіх ніхто не вярнуў. Тым часам Г. Паўльсен выказаў непакой у сувязі з адсутнасцю пячаткі войта, якую даў лаўнікам М. Шаматулу Сапінскаму і Я. Шараўскаму для апячатвання рэчаў падпробашча[39].

На сесіі магістрату 1 сакавіка 1666 г. было разгледжана шмат розных пытанняў, якія тычыліся горада. Акрамя таго былі ўзноўлены пастановы лаўдума ад 20 студзеня 1653 г., згодна з якімі

[37] Ibidem, арк. 112.
[38] Ibidem, арк. 118 адв., 121.
[39] Ibidem, арк. 123–123 адв.

за адсутнасць на выбарахураднік абавязаны быў заплаціць 5 коп літоўскіх грошаў войту, а бурмістр за непрадстаўленне справаздачы – 100 коп каралю. Акрамя таго было прынята рашэнне аб тым, каб прывілеі ад каралёў, дадзеныя гораду, чыталіся публічна. На гэтай жа сесіі магістрат вырашыў выклікаць у суд бурмістра К. Цвікліча за невыкананне сваіх абавязкаў. Удзельнікі паседжання ўзнялі таксама пытанні наконт пражывання радцаў і лаўнікаў у фальварках і вёсках. У выніку яны былі абавязаны жыць у горадзе. Прысутныя прад'явілі таксама прэтэнзіі па выкананню абавязкаў лаўніку Ф. Бабрыкевічам, які, на думку магістрата, нічога не рабіў на карысць горада. У цэхмайстраў і паспольства пыталіся пра прычыну адсутнасці іх на сесіях і кансультацыях. Войт К. Александровіч дадаў, што згодна з пастановай Уладзіслава Вазы 1634 г. яўрэі могуць мець лазню толькі для сябе, а гараджане і прыезджыя не павінны туды хадзіць пад пагрозай пакарання 5 коп літоўскіх грошаў. Будучы прысутны старшы яўрэяў Ісак Фаіш пацвердзіў веданне адпаведанага дэкрэта. Апрача таго магістрат прыняў рашэнне аб тым, што грошы за адкупленне ад шафарства, якія раней ішлі да бурмістраў, зараз трапяць да сендыкаў, а ад іх – да бурмістраў. Адначасова былі праведзены выбары бурмістраў, на якіх перамаглі Ганус Паўльсен і Канстанты Дзіва[40].

На сесіі магістрату 29 мая 1666 г. К. Цвікліч выканаў прысягу, што дазволіла яму заняць пасаду лентвойта. Паколькі Г. Паўльсен быў абраны бурмістрам, то К. Александровіч прызначыў лентвойтам К. Цвікліча. Гэта выклікала пратэст Г. Паўльсена, які абвінаваціў Цвікліча ў несумленным атрыманні пасады. Аднак супраць яго выступіў войт, аргументуючы, што Паўльсен не можа адначасова быць бурмістрам і лентвойтам[41]. Вядома, што ў 1660 г. ён сумяшчаў гэтыя пасады, што было звязана з крызісам улады і адсутнасцю ўраднікаў. Аднак да вайны гэтыя пасады не сумяшчаліся.

[40] Ibidem, арк. 123 адв.-124.

[41] Ibidem, арк. 127 адв.

У 1667 г. выбары першы раз не адбыліся і былі перанесены на 2 тыдні пазней. На сесіі 31 студзеня кандыдатамі ў раду былі Пётр Концкі і Адам Іванішэўскі. У выніку першы быў абраны бурмістрам. Тым часам у лаву прэтэндавалі Адам Ярашэвіч, М. Барысовіч, Лорэнс Блаўт, Ваўжынец Кончэўскі, Ян Роснеўскі, а абраныя былі – М. Барысовіч, Л. Блаўт, А. Ярашэвіч. Першыя два выканалі прысягу, а Ярашэвіч зрабіў гэта пасля вяртання з Каралеўца. На бурмістраўства прэтэндавалі Г. Паўльсен, Я. Зеляпуга, А. Цвікліч, Э. Вільд. У выніку пасады занялі Г. Паўльсен і Э. Вільд. Першы падзякаваў за давер, але на падставе пастановы караля 1653 г. не змог заняць пасаду, паколькі не прадставіў справаздачы за ранейшы перыяд[42]. Верагодна, што Э. Вільд змяніў пратэстанцкае веравызнанне на каталіцкае, паколькі змог прэтэндаваць на бурмістра, а таксама закончылася яго служба стрыёўскага падляснічага.

На 14 сакавіка 1668 г. былі прызначаны справаздачы ўраднікаў. Ф. Бабрыкевіч паведаміў, што Я. Адамовіч за сваё бурмістраўства застаўся вінен яму грошы, якія былі ўзяты для горада, аб чым сведчыў захаваны пазыковы запіс. Магістрат быў вымушаны перанесці справаздачу і прысягу В. Пятроўскага на 15 сакавіка па прычыне адсутнасці некаторых ўрадцаў. Апошнія былі абавязаны заплаціць 50 коп літоўскіх грошаў[43].

Выбары за 1669 г. не занатаваны ў кнізе, але вядома, што бурмістрамі тады сталі Г. Паўльсен і К. Дзіва. Чарговыя выбары адбыліся 11 студзеня 1670 г., а кандыдатамі былі Адам Цвікліч, Якуб Шараўскі, Якуб Шаматула Сапінскі, Ян Зеляпуга. У выніку былі абраныя бурмістрамі А. Цвікліч і Я. Шараўскі[44]. Выбары за 1671 і 1672 г. таксама не зафіксаваны ў кнізе, аднак у 1671 г. бурмістрамі былі Войцех Пятроўскі і Эрхард Вільд, а ў 1672 г. – Адам Цвікліч. На паседжанні магістрату 17 мая 1673 г. было прынята рашэнне

[42] Ibidem,, арк. 138–138 адв.
[43] Ibidem, арк. 159–159 адв.
[44] Ibidem, арк. 194–195.

аб пераносе справаздачы бурмістраў мінулага года на 12 чэрвеня. На гэтай жа сесіі быў абвешчаны ліст ЯКМ і павятовых лаўдум, паводле якіх у горадзе забаранялася крыць дахі саломай, а толькі драніцамі ці гонтам[45].

Бурмістр А. Цвікліч не прадставіў своечасова справаздачу, таму ў сваім тэстаменце згадаў сваё бурмістраўства 1670 і 1672 гг. Для вырашэння гарадскіх спраў ён заклаў золата, срэбра і іншыя рэчы, а ў свайго зяця Радунскага пазычыў грошы пад заставу залатога ланцуга вагой 10 чырвоных злоты, двух пярсцёнкаў (рубінавага і дыяментнага). Справаздачу за 1670 г. ён зрабіў перад магістратам і гарадзенскім падчашым Марцінам Чарніцкім, які быў прызначаны камісарам. Цвікліч прасіў, каб яна была прынята, а ў выпадку з'яўлення пазыкаў прасіў, каб горад іх заплаціў. Таксама адзначыў пра наяўнасць асобнага рэестра з пазыкамі, якія браліся для горада. Пазычаныя грошы прызначаліся для сына Барталамея[46].

Войт С. Александровіч пратэставаў (18 ліпеня 1673 г.) супраць адсутнасці справаздачы бурмістраў. Войцех Пятроўскі адзначыў, што рэестры не гатовы, таму справа была адкладзена на наступную сесію. 21 ліпеня сітуацыя паўтарылася[47].

Падчас аналізу даступных крыніц можна сустрэць інфармацыю аб вызваленні ўраднікаў ад пасад. Напрыклад, 18 ліпеня 1665 г. Ярашэвіч (імя не згадваецца, верагодна Адам) прасіў вызваліць яго ад шафарства, паколькі ён выконваў іншыя розныя паслугі для горада. Прычыну палічылі слушнай[48]. На паседжанні 26 лютага 1666 г. у сувязі з дрэнным станам здароўя сендык Лукаш Дорбах заявіў, што не можа выконваць даручаныя яму абавязкі, а на сваё месца прапанаваў Готфрыда Варланга[49].

---

[45] Ibidem,, арк. 258 адв.
[46] Ibidem, арк. 160 адв.–161.
[47] Ibidem, арк. 265–265 адв.
[48] Ibidem, арк. 118.
[49] Ibidem, арк. 123 адв.

*Канфлікты ў магістраце, скаргі на ўраднікаў.* У 1659 г. узнік канфлікт паміж лентвойтам Г. Паўльсенам і сендыкам Л. Ласкевічам. Апошні неаднаразова выклікаўся ў суд, але не прыходзіў. Падчас разгляду справы лаўнік Пётр Ляўковіч патрабаваў для Ласкевіча 12 тыдняў зняволення па прычыне таго, што апошні з'яўляўся ў суд у нецвярозым стане, зневажаў урад, зрываў сесіі, прыводзіў да страт, бунтаваў паспольства. У выніку суд вырашыў пазбавіць яго свабоды тэрмінам на 6 тыдняў. Аднак справа гэтым не закончылася. Ласкевіч абвінаваціў Г. Паўльсена ў крыўдах і шкодах мяшчан у горадзе і вёсках. Было праведзена апытанне паспольства – цэхмайстраў. Усе былі запрошаны на ратушы і пацвердзілі ад сябе і ўсяго цэху, што не мелі ніякіх шкодаў і праблемаў ад Паўльсена. Сярод іх былі цэхмайстар мечнікаў Марцін Казакевіч, цэхмайстар слесараў Якуб Нуймека, цэхмайстар кавалёў Крыштаф Бараноўскі, цэхмайстар катляроў Мальхер Пятровіч, цэхмайстар цесляроў Францішак Белькоўскі, муляр Фёдар Хоцкевіч, цэхмайстар бондароў Еліяш Стэфановіч, шавецкі цэхмайстар Ваўжынец Козерацкі (сведчыў дадаткова, што Ласкевіч хадзіў ад дому да дому і бунтаваў супраць лентвойта), рэзнікаў цэхмайстар Андрэй Івановіч, цэхмайстр гарбарскі Якуб Адамовіч, Іван Карлоўскі з вёскі Карлава, Марцін і Станіслаў Цвіклічы, Лаўрын Ёткоўскі, Стэфан Янкоўскі, Хрэгор Ганчар з вёскі Цвіклічы, Якуб Барташэвіч, Ян Цвікліч, Станіслаў Бутока, Фёдар Бараноўскі з Малахавічаў, Ян Кānановіч з Перахрыставіч, Стэфан Чэрэшка з Гібуліч і Зеляпуга, бурмістр Ян Адамовіч, Юзаф Адамовіч, Адам Іванішэўскі з вёскі Адамавічы, квартэрмайстр Фёдар Бабрыкевіч[50].

Лаўнік Каспер Урублеўскі (былое прозвішча Варабей) неаднойчы выклікаўся ў суд за парушэнне парадку і абразы. 17 студзеня 1663 г. яго абвінавацілі ў з'яўленны на сесіі ў нецвярозым стане. Ураднікі Якуб Шараўскі і Пётр Конццкі патрабавалі, каб ён 4 тыдні адсядзеў у ратушы, папрасіў прабачэння і заплаціў спагнанне. Каб

[50] Ibidem, арк. 9 адв.–13, 16 адв.–17.

у будучым ніхто болей так сабе на паводзіў было вырашана забараніць Касперу прысутнічаць на сесіях цэлы год, зняволіць на 2 тыдні і заплаціць віну. На паседжанні суда 24 лістапада 1664 г. лаўнік стаў лаяцца і пагражаць сендыку Міхаілу Барысовічу, у выніку чаго сарваў сесію. Пасля таго, як Барысовіч выйшаў з суда, на яго напаў са зброяй Каспер, збіў нагамі, нанёс шматлікія раны. У выніку сендыка ледзь выратавалі. Лаўнік Сымон Шаматула Сапінскі падаў скаргу на Урублеўскага за абразу гонару. Ён характарызаваў Каспера як злога чалавека, здольнага на дрэнныя ўчынкі[51].

Заслугоўвае ўвагі іншы выпадак. Лаўнік М. Шаматула Сапінскі падаў пратэстацыю на лентвойта К. Цвікліча. 30 студзеня 1668 г., калі сабраліся на сесію ў доме бурмістра Я. Зеляпугі ён устаў са свайго месца, адхіліў былога бурмістра Г. Паўльсена і пачаў сам весці сесію. Ён пачаў разгляд справаў са сваіх прыватных спраў з лаўнікам К. Вроблеўскім. Калі Шаматула пабачыў, што ідзе парушэнне працэдуры і замест крымінальнай справы разглядаюцца прыватныя, ён, як старшы лаўнік, нагадаў пра парадак вядзення сесіі, на што лентвойт пачаў крычаць і абражаць[52].

У кнізе войта сустракаецца скарга на неправавыя дзеянні ураднікаў бурмістраўска-радзецкага суда. Справа пачалася са скаргі ў войтаўскі суд купца Тамаша Цэнклера на бельскага старога бурмістра Габрыэля Арцішэвіча і бельскага радцу Сільвестра Рамановіча. Яны мелі агульны гандаль і крамы ў Гародні з рознымі таварамі. Для крамы скаржніку параілі чалядніка Давіда Косідоя, які працаваў у яго два гады, пасля чаго зышоў, калі не было купца, забраўшы тавару на 5 000 злотых (1669, 1671). 7 сакавіка 1671 г. Т. Цэнклер падаў скаргу на бурмістра В. Пятроўскага, радцаў К. Дзіву, Я. Шаматулу Сапінскага, М. Багдановіча і на радзецкага пісара Казіміра Мікалаевіча. 6 сакавіка ўраднікі не хацелі вынесці прысуд па

---

[51] НГАБ, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 71 адв.; ф. 1761, воп. 1, спр. 2, арк. 68–68 адв., 224–224 адв., 239–239 адв.

[52] НГАБ, ф. 1761, воп. 1, спр. 2, арк. 157–157 адв.

справе з бельскімі мяшчанамі. Пра гэта сведчыць рэляцыя енерала Мікалая Славуцкага, які быў выкліканы 6 сакавіка чэляднікам Юрыя Лабачэвіча па просьбе Г. Арцішэвіча і С. Рамановіча. Ураднікі павінны былі разгледзіць справу, а замест гэтага яны адправілі яе на апеляцыю. Бурмістр В. Пятроўскі, радзецкі пісар К. Мікалаевіч нават не хацелі ісці ў судовую ізбу. Скарга была пададзена і ад Г. Арцішэвіча і С. Рамановіча на бурмістра В. Пятроўскага, радцаў Я. Шаматулу, А. Цвікліча, М. Багдановіча, М. Шаматулу Сапінскага, К. Урублеўскага, Ю. Адамовіча і на радзецкага пісара К. Мікалаевіча. У ёй таксама адзначалася пра адмову Пятроўскага і Мікалаевіча. 10 чэрвеня 1672 г. справа зноў разглядалася ў судзе, куды быў выкліканы енерал Г. Арцішэвіч і С. Рамановіч у справе з купцом Тамашам Ценклерам, каб яны назіралі за працэсам[53]. З дакументаў не вынікае чым скончылася правапарушэнне для ўраднікаў.

У войтаўска-лаўніцкі суд падаў скаргу вайтоўскі-лаўнічы пісар Тамаш Адамовіч супраць гарадзенскага лаўніка Себасцяна Леваневіча. Пісара абвінавацілі ў карупцыі, у выдачы неадпаведнага дэкрэта ў справе Пачобута. Сам Т. Адамовіч на той час ужо больш за 20 гадоў засядаў у магістраце і ведаў парадак вядзення спраў, а справа Пачобута ўжо пайшла ў Асэсарскі суд. Леваневіч быў чалавека простым і непісьменным. Ён не дапільнаваў згаданай справы, а сваю віну перакінуў на Адамовіча. Яго дзеянні прывялі да шкоды і няславы пісара (1688)[54]. Вынік справы не выяўлены.

Асобна варта згадаць справу каралявецкіх купцоў Крыштафа Фонмелена і Струзборка з гарадзенскім магістратам аб забранні 51 бочкі солі ў 1655 г. 14 сакавіка 1665 г. яны падалі на сесіі бурмістраўска-радзецкага суда дэкрэт з Асэсарскага суда. Ураднікі абавязаліся вывучыць справу на працягу 8 тыдняў і даць адказ на дэкрэт[55]. У сувязі з вайной разгляд пытання прыйшоўся на паслява-

---

[53] Ibidem, арк. 194, 232 адв., 234–236, 237, 309–309 адв., 311, 321.

[54] AGAD, Zbiór Józefa Jodkowskiego, sygn. 8.

[55] НГАБ, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 112–112 адв.

енны час. 26 чэрвеня 1666 г. ад імя свайго памерлага бацькі Яна Адамовіча, былога бурмістра, па справе адказваў лаўнік Тамаш Адамовіч. Ён быў гатовы аддаць соль. 10 студзеня 1660 г. К. Фонмеліна прадстаўляў слуга Міхаіл Лілевель. Справу перанеслі да прыбыцця ў горад купца на 4 лютага 1667 г. Скончылася яна толькі ў 1673 г. У выніку магістрат пастанавіў вярнуць соль. Паводле следства радцы Тамаша Адамовіча ад 28 мая 1666 г. выявілася, што ў 1653 г. для сябе забралі соль ураднікі: бурмістр Ян Адамовіч – 8 бочак, бурмістр Ян Явароўскі – 6, Станіслаў Цвікліч – 6, Мацей Ябланоўскі – 4, Фольтын Шульц – 2, Войцех Пятроўскі – 6, Ян Цвікліч – 2, Павел Кроснеўскі – 1, Тамаш Лагоўскі – 2, Мікалай Кудаеўскі – 2, жонка П. Ляўковіча – 3. Рэшту бочак бурмістр і радцы наклалі на горад[56].

Ліст да магістрату Яна Казіміра 2 студзеня 1688 г. негатыўна ацэньваў яго працу і патрабаваў навядзення парадку ў горадзе, а таксама сведчыў пра наяўнасць істотных праблем. У першую чаргу парушалася магдэбургскае права: мяшчане прадалі дамы ў горадзе яўрэям, а самі пераязджалі ў вёскі. Акрамя гэтага пералічваліся наступныя прэтэнзіі: незаконнае распараджэнне каралеўскім уладаннямі, ператварэнне хрысціянскага горада ў іўдзейскі, перадача яўрэям даходы з фальваркаў, важніцы, крамаў, брукавага, неправядзенне рэстаўрацыі горада, ратушы і гадзінніка, нявыплаты на ратушу, адсутнасць муроў вакол горада і брамаў, нявыплату грошаў прабоству для ўсталявання муроў вакол могілак і званіцы[57].

Агучаныя вышэй праблемы паўтараліся ў наступным дакуменце. Ліст з прэтэнзіямі ад Яна Казіміра быў таксама накіраваны яўрэям 2 студзеня 1688 г. Іх абвінавачвалі ў тым, што яны выцеснілі з вуліцы Замкавай хрысціян, а горад зрабілі яўрэйскім, перашкаджалі манахам, паставілі корчмы на хрысціянскіх могілках, хавалі памерлых ў горадзе каля каралеўскай рэзідэнцыі на вул. Замкавай,

[56] *Ibidem*, арк. 128–128 адв., 268, 270 адв.–271.

[57] Lietuvos mosklų akademijos Bibliotekas rankraščtų skyrius, f. 16–207, l. 81.

а павінны былі рабіць гэта за горадам, будавалі у розных месцах, не прадавалі алкаголь у суботу хрысціянам, а ў хрысціянскія святы наўмысна корчмы адчынялі і прываблівлі музыкай, бралі хрысціянскую чэлядзь на працу, прадавалі таней піва і збожжа за латку, набывалі крадзеныя рэчы, праводзілі з'езды ў гарадзенскай сінагозе, Берасце, Пінску і іншых месцах без дазволу, выязджалі за мяжу без ведама ўраднікаў, не давалі грошай на рэстаўрацыю, не будавалі у дамах мураваных комінаў. Суд загадаў ім заключыць з горадам пагадненне і выправіць усе памылкі[58].

*Высновы*. У параўнанні з магістрацкай кнігай 1639–1642 гг. у разглядаемы перыяд з'яўляюцца дакументы па выбарах у магістрат, а таксама розныя сведчанні пра працу магістрата. На падставе аналізу гэтых крыніц можна зрабіць выснову, што ў пасляваенны перыяд павялічылася роля войта. Ён прысутнічаў на паседжаннях і кантраляваў працу магістрата. Акрамя таго, кніга войта дазваляе дапоўніць інфармацыю наконт працы войтаўска-лаўніцкага суда, паколькі ўтрымлівае выпісы з яго.

Пасля вызвалення ад маскоўскіх войскаў гарадзенскі магістрат сутыкнуўся з шэрагам праблем. Маскоўскія войскі моцна панішчылі судовыя архівы ў выніку чаго за даваенны перыяд засталася толькі адна кніга. Загінулі таксама сямейныя архівы мяшчан. У сувязі з гэтым правы на ўласнасць і іншыя дакументы прыйшлося аднаўляць па ўспамінах. Колькасць насельніцтва ў горадзе ў гэты час паменшылася, а тое што засталося, моцна збяднела. Горад знаходзіўся ў фінансавым крызісе. Акрамя таго ўзрос узровень злачыннасці. У крыніцах сустракаюцца звесткі аб злоўжываннях з боку ўраднікаў. Спатрэбілася некалькі год, каб наладзіць працу магістрата і справаводства, а таксама навесці адносны парадак у горадзе.

---

[58] Ibidem,, l. 82.

## Бібліяграфія

Archiwum Główne Aktów Dawnych (далей: AGAD), Archiwum Radziwiłłów (dalej: AR), dz. IV, kopie, sygn. 745.

AGAD, AR, dz. V, sygn. 11208/II.

AGAD, AR, sygn. 1735.

AGAD, Zbór Józefa Jodkowskiego, sygn. 8.

Borowik P., *Funkcjonowanie samorządu miejskiego w Grodnie podczas „potopu moskiewskigo" (1655–1661) oraz kilka uwag o zniszczeniu miasta przez Moskali*, [y:] *Garadzienski palipmsest.* XII–XX *stst. Materialy mizhnarodnaj navukiwaj kanferencji (Harodnia, 7 listapada 2008 g.) pad red.* A. Smalenchuka, N. Slizh, Harodnia-Belastok 2009, s. 29–39 [*Гарадзенскі палімпсест XII–XX стст. Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі (Гародня, 7 лістапада 2008 г.)*, пад рэд. А. Смаленчука, Н. Сліж, Гародня–Беласток 2008, с. 29–39].

Dounar A. *Pastanova kamisarau Jana Kazimira Vazy 1650 goda ab paradku kiravannia u Harodni* [u:] *Garadzienski palipmsest. 2009. Dziarzhaunyja ustanovy i palitychnae zhyccio*, pad red. A. Smalenchuka, N. Slizh, Harodnia 2009, s. 118–127 [Доўнар А., *Пастанова камісараў Яна Казіміра Вазы 1650 года аб парадку кіравання ў Гародні*, [y:] *Гарадзенскі палімпсест. 2009. Дзяржаўныя ўстановы і палітычнае жыццё. XV–XXст.,* пад рэд. А. Смаленчука, Н. Сліж, Гародня 2009, с. 118–127].

Jackevich Z., V. Urubleuski, *Garadzienski magistrat u XVII st.* [u:] *Garadzienski palipmsest. 2009. Dziarzhaunyja ustanovy i palitychnae zhyccio*, pad red. A. Smalenchuka, N. Slizh, Harodnia 2009, s. 118–127 [Яцкевіч З., Урублеўскі В., *Гарадзенскі магістрат у XVII ст.* [y:] *Гарадзенскі палімпсест. 2009. Дзяржаўныя ўстановы і палітычнае жыццё. XV–XX* ст., пад рэд. А. Смаленчука, Н. Сліж, Гародня 2009, с. 75–117].

Kossarzecki K., *Kampania 1660 godu u Ltwie*, Minsk 2011 [Касажэцкі К., *Кампанія 1660 году ў Літве*, Мінск 2011.

Lietuvos mosklų akademijos Bibliotekas rankraščtų skyrius, f. 16-207.

Lietuvos Valstybės istorijos archyvas, f. 694, ap. 1, b. 4663.

*Metryka Litewska. Księga wpisów nr 131*, oprac. A. Rachuba, Warszawa 2001.

Nacyjanalny histarychny archiu Belarusi, f. 1761, vop. 1, spr. 1–3; f 1800, vop. 1, spr. 1 [Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, ф. 1761, воп. 1, спр.1–2; ф. 1800, воп. 1, спр. 1].

Slizh N. *Haradzienski bumistarska-radziecki sud: suadnosiny sudovaj praktyki z magdeburgskim pravam (1638–1642 gady.),* „Palitychnaja sfera: Gistoryia: litaratura, prava, palityka", 2014–2015, № 22–23, s. 35–51 [Сліж Н., *Га-*

*радзенскі бурмістраўска-радзецкі суд: суадносіны судовай практыкі з магдэбургскім правам (1639–1642 гады)*, „Палітычная сфера. Гісторыя: літаратура, права, палітыка", 2014–2015, № 22–23, с. 35–51].

Slizh N. *Haradzienski vojtauska-launicki sud (1638–1644 gg.)*, „Białoruskie Zeszyty Historyczne", 2016, t. 45, s. 46–71 [Сліж Н., *Гарадзенскі войтаўска-лаўніцкі суд* (1638–*1644 гг.): суадносіны судовай практыкі з магдэбургскім правам*, „Białoruskie Zeszyty Historyczne", 2016, t. 45, s. 46–71].

Slizh N. *Kupcy Fandeberki u Harodni u XVII st.*, „Archivirius", 2016, vyp. 14 s. 347–357 [Сліж Н., *Купцы Фандэберкі ў Гародні ў XVII* ст., „Архіварыус", 2016, вып. 14, с.].

## The work of the Hrodna magistrate in the second half of the seventeenth century

This article is devoted to activities of the Hrodna magistrate in the second half of the seventeenth century. The difficult period of the war of 1654–1667 provoked the problems connected with the restoration of the work of the magistrate. The research is based on the books of the court's records. In the postwar period, the role of the voyt increased. He attended meetings and oversaw the work of the magistrate. The magistrate faced a number of problems. Moscow troops severely damaged the court archives. The town was ruined. The population of the town decreased. Townspeople became poor. Hrodna was in financial crisis. The cases of corruption were between officials. It took long period of time to set up the work of the magistrate and to introduce order in the town.

Keywords: Grodno, town hall, judiciary, commune head